**КЛЕТКІ** — вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 23 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў — Сураж, 180 км ад Магілёва, на захадзе мяжуе з лесам. На ПнЗ штучная сажалка, на ПнУ мелія- рацыйны канал, злучаны з р. Чарняўка (прыток р. Бесядзь). Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы — Касцюковічы.

Вядома з 18 ст. У 1777 г. вёска ў Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. У 1799 г. 14 двароў, 92 жыхары. У 1834 г. у Чэрыкаўскім павеце, 117 сялянскіх душ, уладанне памешчыцы Саламеі Гайковай. У 1868 г. вёска належала памешчыку М. Казлоўскаму, які валодаў 140 дзесяцінамі зямлі. Адносілася да праваслаўнага Саматэвіцкага прыхода Троіцкай царквы.

У 1909 г. 19 двароў, 162 жыхары, у Саматэвіцкай воласці. З 20.08. 1924 г. вёска ў Саматэвіцкім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна. У 1926 г. 26 двароў, 155 жыхароў. У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас.

У Вялікую Айчынную вайну 29.09.1943 г. вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле перапісу 1959 г. – 347 жыхароў, у 1986 г. – 63 гаспадаркі, 143 жыхары, у складзе саўгаса «Дуброва» (цэнтр — в. Белая Дуброва). Працавалі клуб, бібліятэка, магазін. У 2002 г. 5 гаспадарак, 5 жыхароў. Планіроўка прамавугольная. Забудавана рэдка драўлянымі сялянскімі хатамі.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі большасць жыхароў адселена ў в. Белая Дуброва.